Падтрымай "Вясну" на PATREON

"Фашыст", "выродак", "с*ка, герой!": за якія каментары ў сацсетках судзілі беларусаў на гэтым тыдні

19.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, дыфамацыя

Праваабаронцы і валанцёры "Вясны" працягваюць маніторыць судовыя пасяджэнні па крымінальных справах, звязаных з нецярпімасцю беларускіх уладаў да любых формаў праяваў пратэсту. Паводле інфармацыі праваабаронцаў, самым распаўсюджаным інструментам рэпрэсій сёння з'яўляецца крымінальны пераслед па дыфамацыйных артыкулах: за абразу прэзідэнта, прадстаўнікоў улады, суддзяў, а таксама за здзек з дзяржаўных сімвалаў (арт. 368, 369, 370, 391 КК). "Вясна" распавядае, каго і за што на гэтым тыдні асудзілі ў Беларусі па гэтых артыкулах Крымінальнага кодэкса.



Дыфамацыйныя артыкулы ў Крымінальным кодэксе Беларусі: адказваем на пытанні

Міжнародныя арганізацыі па правах чалавека разглядаюць дыфамацыю ў кантэксце права на выказванне меркавання і права на свабоду слова. Дэкрыміналізацыя дыфамацыйных правапарушэнняў з'яўляецца стандартам, сфармуляваным і абгрунтаваным у рашэннях шэрагу міжнародных арганізацый.

Маладзечна: 1,5 гады "хатняй хіміі" за каментар пра ўчастковага

18 лістапада ў судзе Маладзечна і Маладзечанскага раёна вынесены прысуд **Сяргею Валканоўскаму**. Суддзя **Іна Каханоўская** вынесла прысуд 34-гадоваму маладзечанцу, прызнаўшы яго вінаватым паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса: 1,5 года “хатняй хіміі”. Таксама Валканоўскі мусіць выплаціць на карысць пацярпеламу 1000 рублёў. Бок абвінавачання падтрымала пракурорка **Юлія Жук**.

Пацярпелы – бабруйскі міліцыянт **Андрэй Комар** – на пасяджэнне не з'явіўся, але папрасіў тысячу рублёў кампенсацыі маральнай шкоды. Згодна з абвінавачаннем, Валканоўскі пакінуў каментар "Ублюдак" у "Аднакласніках" пад фотаздымкам Комара, чым яго абразіў. Мужчына прызнаў віну.

Пракурорка папрасіла пакараць мужчыну 1,5 гадамі "хатняй хіміі" – менавіта такі прысуд вынесла суддзя.



Новая "перамога" ўчастковага Комара: гэтым разам 3 гады "хатняй хіміі" за каментар пад ягоным здымкам далі 50-гадовай мінчанцы

Яшчэ нядаўна мы пісалі пра суд над 62-гадовай Наталляй Кавалёвай з Клімавічаў. 15 лістапада яе прызналі вінаватай у абразе ўчастковага з Бабруйска Андрэя Комара за абразлівы каментар пад ягоным здымкам у "Аднакласніках", асудзілі да 1,5 года "хатняй хіміі" і спагналі 1000 рублёў на карысць пацярпелага ў якасці маральнай шкоды.

Магілёў: 2,5 гады калоніі за расклейванне ўлётак

18 лістапада ў судзе Ленінскага раёна Магілёва вынеслі прысуд **Сяргею Батура**. Мужчына быў асуджаны па ч. 2 арт. 368 КК (абраза прэзідэнта). Судовыя паседжанні праходзілі ў закрытым рэжыме, таму, на жаль, падрабязнасці даведацца не ўдалося. Прычыны закрыцця таксама невядомыя.

Нагадаем, што затрымалі Сяргея ў пачатку чэрвеня 2021. Разам з ім была **Наталля Яцкова**, якая па заканчэнні 72 гадзін была адпушчаная пад падпіску аб нявыездзе. Але жанчыне ўдалося пакінуць межы Рэспублікі Беларусь і цяпер яна знаходзіцца ў бяспецы.

Затрыманыя яны былі пры расклейванне ўлётак з выявай **Аляксандра Лукашэнкі**. Які праязджаў міма супрацоўнік Дэпартамента аховы, заўважыў іх і выклікаў нарад міліцыі.

Судовы працэс пачаўся 1 лістапада. Дзяржаўным абвінаваўцам выступала **Марыя Івуціна**. Максімальнае пакаранне па ч. 2 арт. 368 КК РБ на дадзены момант прадугледжвае да пяці гадоў пазбаўлення волі. Да ўнясення змяненняў, якія ўступілі ў сілу 19 чэрвеня, гэты артыкул прадугледжваў максімум 3 гады пазбаўлення волі. І судзілі Сяргея ў рамках старой рэдакцыі. У выніку суддзя **Ксенія Нікіфарава** вынесла рашэнне – 2 гады 6 месяцаў калоніі агульнага рэжыму. Практычна максімальны тэрмін.

Пінск: 2 гады "хатняй хіміі" і 1000 рублёў кампенсацыі за каментар у "Аднакласніках"

У судзе Пінскага раёна і г. Пінска 17 лістапада вынеслі прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні да **Дзяніса Стасевіча**, якога вінавацілі ў абразе прадстаўніка ўлады паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса.

Справу разглядала суддзя **Вольга Лубнік**, бок дзяржабвінавачвання прадстаўляў **Ілля Гузарэвіч**. Пацярпелым па справе быў прызнаны супрацоўнік ДАІ **Ігар Вольніч**, на пасяджэнне ён не з'явіўся, прасіў праводзіць працэс без яго.

Паводле абвінавачвання, 25 чэрвеня 2020 года з мэтай прыніжэння гонару і годнасці супрацоўніка міліцыі Вольніча ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў, Дзяніс Стасевіч на старонцы Вольгі Карач у сацыяльнай сетцы "Аднакласнікі" напісаў каментар пад публікацыяй пра міліцыянта, які на фотаздымку прыціскае каленам шыю пенсіянера, наступнага зместу: ***"С*ка, герой!"***. Сваімі наўмыснымі дзеяннямі абвінавачаны абразіў Вольніча, чым здзейсніў злачынства паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса.

Стасевіч віну прызнаў цалкам, у здзейсненым раскаяўся. Ад дачы паказанняў у судзе абвінавачаны адмовіўся. Вольга Лубнік агучыла тыя паказанні, якія Дзяніс даваў падчас следства: з Вольнічам абвінавачаны не быў знаёмы і ніколі з ім не сустракаўся, падставаў для абразы міліцыянта не было. Наконт пакінутага каментара Стасевіч тлумачыў: летам 2020 года ён пабачыў у "Аднакласніках" публікацыю, на якой супрацоўнік ДАІ наступіў затрыманаму чалавеку, што ляжаў на зямлі, каленам на галаву ці на шыю, пасля гэтага абвінавачаны, паддаўшыся агульнаму настрою і хайпу, а таксама ў сувязі з падзеямі ў ЗША, дзе паліцэйскі прыдушыў грамадзяніна каленам і той памёр, пакінуў негатыўны каментар пад публікацыяй. Паведамленне было адрасаванае супрацоўніку міліцыі, які затрымліваў чалавека, бо такі спосаб затрымання Дзяніса моцна абурыў. Пасля гэтага пра пакінуты каментар нікому не расказваў і не ўспамінаў пра яго, пакуль да мужчыны не прыйшлі супрацоўнікі міліцыі.

Пацярпелы Ігар Вольніч накіраваў заяву ў суд, у якой прасіў спагнаць з абвінавачанага кампенсацыю нанесенай маральнай шкоды ў памеры 1500 рублёў. З пазовам Дзяніс Стасевіч пагадзіўся, але прасіў паменшыць памер кампенсацыі, бо не мае магчымасці сплаціць такую суму.

Падчас спрэчак бакоў Ілля Гузарэвіч прасіў прызначыць абвінавачанаму два гады “хатняй хіміі”, а грамадзянскі пазоў задаволіць з улікам прынцыпаў разумнасці і справядлівасці.

У апошнім слове Дзяніс Стасевіч прынёс прабачэнні пацярпеламу супрацоўніку Ігару Вольнічу, абяцаў, што больш такога не паўторыцца.

У выніку суддзя Вольга Лубнік прызнала Дзяніса Стасевіча вінаватым і па арт. 369 КК **прызначыла яму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання** ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу **тэрмінам на два гады**, канфіскаваць тэлефон у даход дзяржавы як сродак здзяйснення злачынства, а таксама **спагнаць з абвінавачанага** на карысць пацярпелага **кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 1000 рублёў**.

Мінск: жанчыну другі раз асудзілі за "абразу" у каментарах



Ірына Сташкевіч

17 лістапада суд Ленінскага раёна Мінска вынес прысуд 54-гадовай **Ірыне Сташкевіч**. Суддзя **Марына Запаснік** асудзіла яе да 1,5 гадоў “хатняй хіміі” паводле арт. 369 КК. З улікам мінулага тэрміна пакаранне засталося ранейшым: два гады “хатняй хіміі”. Раней Ірыну Сташкевіч ужо асудзілі на гэты тэрмін паводле арт.369 за каментар у бок начальніка ГУБАЗіК МУС **Паршына**.

Пяць гадоў таму АНТ зняў сюжэт пра Ірыну Сташкевіч: жанчына аформіла апякунства над дачкой суседкі, якая памерла.

Бок дзяржабвінавачання падтрымліваў пракурор **Кот**. Пацярпелы – супрацоўнік маладзечанскай інспекцыі **Яўген Калясень** – на паседжанне не з’явіўся.

Ірыну прызналі вінаватым у тым, што ў тэлеграм-канале яна пакінула каментар у непрыстойнай форме пад фотаздымкам капітана міліцыі Яўгена Калясені. Доказамі ў справе прынятыя скрыншоты, мабільны тэлефон, дыскі са сведчаннямі пра выхад у інтэрнэт, заключэнне лінгвістычнай экспертызы.

У матэрыялах справы таксама – раздрукоўкі з каментарамі палітолага Шпакоўскага, звесткі пра перасячэнні Сташкевіч мяжы Літвы і Польшчы, а таксама скрыншоты каментароў іншых людзей пад фотаздымкам Калясені.

Абвінавачаная распавяла, што калі была ў Маладзечне, то патэлефанавала Калясені і папрасіла прабачэння. Яна разумела, што пакідае негатыўны каментар пад фота прадстаўніка ўлады – зрабіла гэта не падумаўшы. Па словах Сташкевіч, каментар складаўся з аднаго слова **“фашыст”**. Яна поўнасцю прызнае віну.

Пацярпелы распавёў, што пра каментар яму распавяла жонка. Ён зрабіў скрыншот і даслаў у ГУБАЗіК. Яе каментар прычыніў яму маральныя пакуты.

Пракурор папрасіў улічыць змякчальныя абставіны: чыстасардэчнае прызнанне і малалетняга сына. Ён папрасіў прызначыць пакаранне на тэрмін год і месяц “хатняй хіміі”, а з улікам бягучай справы – два гады “хатняй хіміі”.

Кобрын: 2 гады "хатняй хіміі" за абразу намесніка начальніка ДАІ

У судзе Кобрынскага раёна 17 лістапада была разгледжана крымінальная справа ў дачыненні да мясцовага жыхара **Андрэя Якубовіча**, якога абвінавацілі ў абразе прадстаўніка ўлады па арт. 369 Крымінальнага кодэксу. Справу разглядала суддзя **Таццяна Каберская**, бок дзяржабвінавачвання прадстаўляў памочнік пракурора **А. Шыкавецкі**.

Згодна з абвінавачваннем, Андрэй Якубовіч 9 кастрычніка 2020 года абразіў падпалкоўніка міліцыі, намесніка начальніка Гарадзенскага ДАІ **Аляксандра Вайцешку** ў каментарах у “Аднакласніках”. Нецэнзурнае выказванне было расцэнена як абраза прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў. Пацярпелы Вайцешка на пасяджэнне не прыехаў і матэрыяльных патрабаванняў не заяўляў.

Якубовіч на судзе цалкам прызнаў сваю віну і раскаяўся ў зробленым. Ён распавёў, што ў той дзень глядзеў стужку ў “Аднакласніках”. У суполцы “Беларусь пра ўсё” было размешчана відэа, дзе ўзгадваўся Вайцешка. Пад відэа было шмат негатыўных каментароў пра яго, і Якубовіч не стрымаўся, і таксама напісаў абразлівы каментар. Ён папрасіў прабачэння ў пацярпелага і адзначыў, што дакладна не хацеў пакрыўдзіць яго.

З улікам раскаяння абвінавачанага, памочнік пракурора Шыкавецкі папрасіў суд пакараць яго двума гадамі абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу (“хатняя хімія”). Менавіта такое пакаранне і вынес суд Кобрынскага раёна.



На адзін год "хіміі" асудзілі жыхара Быхава за абразу супрацоўніка ДАІ

У судзе Быхаўскага раёна разгледзелі крымінальную справу ў дачыненні да 22-гадовага мясцовага жыхара Андрэя Круглені, які абвінавачваецца ў абразе прадстаўніка ўлады. 17 лістапада мужчыну асудзілі да аднаго года "хіміі".

Баранавічы: 2 гады "хіміі" за сарваны дзяржаўны сцяг

У судзе Баранавіцкага раёна і г. Баранавічы 17 лістапада агучылі прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні да **Аляксандра Гаўрыльчыка**, якога вінавацілі ў здзеку з дзяржаўных сімвалаў (арт. 370 Крымінальнага кодэкса). Справу разглядаў суддзя **Сяргей Данільчык**, бок дзяржаўнага абвінавачвання прадстаўляла **Вераніка Палулех**.

Паводле абвінавачвання, вечарам 16 верасня 2021 года **Аляксандр Гаўрыльчык**, знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення і маючы намер на здзек з дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь, дацягнуўся да дрэўка сцяга, замацаванага на краме "Южанка" ў г. Баранавічы, пасля чаго, праяўляючы паказную смеласць і дзёрзкія паводзіны, дэманстратыўна сарваў сцяг і пашкодзіў дрэўка, разламаўшы яго на дзве часткі, пранёс сцяг да месца свайго жыхарства. Сваімі дзеяннямі Гаўрыльчык здзейсніў злачынства паводле арт. 370 Крымінальнага кодэкса.

Аляксандр Гаўрыльчык прызнаў віну цалкам. У судзе патлумачыў, што ў той дзень піў піва і трохі гарэлку, пасля праводзіў сябра: яны падышлі да банкамату каля крамы "Южанка", знялі грошы, а калі абвінавачаны вяртаўся дадому — пабачыў сцяг.

> *“Мы з сынам часта ходзім на футбол, дзе ёсць аматары са сцягамі. Сын спытаў у мяне, дзе наш сцяг. І я нічога больш не прыдумаў, як сарваць сцяг. Сарваў сцяг і прынёс дадому”,* — распавёў Аляксандр Гаўрыльчык.

Мужчына хацеў пакінуць сцяг сабе.

У судзе апыталі сведку — сябра абвінавачанага **Леаніда Ляшкевіча**. Ён распавёў, што 16 верасня прыехаў да абвінавачанага, мужчыны набылі ў краме алкаголь, выпілі, пасля Ляшкевіч вырашыў, што паедзе дадому на таксі — таму пайшлі да крамы, каб зняць грошы ў банкамаце. Пасля Гаўрыльчык пабачыў сцяг на краме і захацеў яго зняць, а сведка пачаў адгаворваць, што не трэба гэтага рабіць. Аднак Аляксандр не паслухаўся і зняў сцяг рукой. Нехта з супрацоўнікаў крамы выйшаў і крычаў мужчынам услед, але яны проста сышлі. Потым сябры разышліся па дамах.

Сведкі — супрацоўнікі крамы “Южанка” — у суд не з’явіліся. Судовае следства было скончанае без іх выкліку.

Падчас спрэчак бакоў пракурорка прасіла суд прызнаць Аляксандра Гаўрыльчыка вінаватым і па арт. 370 КК прызначыць яму два гады “хіміі”, а сцяг перадаць краме “Южанка” па прыналежнасці.

Абвінавачаны сказаў, што аступіўся, але “кожны чалавек мае права на другі шанец, каб загладзіць свае памылкі”.

> *“Я ні ў якім разе не хацеў абразіць сваю краіну або здзекавацца са сцяга. Хоць гэта расцэнена як здзек, але менш за ўсё я хацеў паздзекавацца з дзяржаўнай сімволікі. Хачу папрасіць прыняць да ўвагі змякчальны фактар маёй віны — цяжкую хваробу сына, якога прыходзіцца вазіць у Мінск кожны месяц”,* — сказаў Гаўрыльчык.

У выніку суддзя прызначыў Аляксандру Гаўрыльчыку пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на два гады.

Дуброўна: 3 гады "хатняй хіміі" і штраф за абразу пракурора

У судзе Дубровенскага раёна паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса (абраза прадстаўніка ўлады) асудзілі 40-гадовага **Юрыя Свіціна**.

Паводле версіі абвінавачвання, што Свіцін у жніўні 2021 года, знаходзячыся ў г. Барані Аршанскага раёна, з дапамогай мабільнага тэлефона са свайго ўліковага запісу ў сацыяльнай сетцы "Аднакласнікі" размясціў абразлівы каментар на адрас пракурора Дубровенскага раёна. Такі каментар Свіцін размясціў у сувязі са спыненнем пракурорскім работнікам супрацьпраўных дзеянняў у грамадскім месцы.

У судовым пасяджэнні абвінавачаны прызнаў віну і раскаяўся.

У выніку, суддзя **Марыя Цыклінская** асудзіла Юрыя Свіціна да трох гадоў "хатняй хіміі" і аштрафавала на 100 базавых велічыняў. Акрамя гэтага, да яго ўжытыя прымусовыя меры бяспекі і лячэння ад алкагалізму і быў канфіскаваны тэлефон.

Суд таксама пастанавіў спагнаць з абвінавачанага на карысць пацярпелага пракурора матэрыяльную кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры адной тысячы рублёў.

Твитнуть













АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

CC BY